

# ГРЭЦКІЯ АРЭХІ

Людміла КЕБІЧ

Светлым ліпеньскім днём па шашэйнай дарозе ў накірунку вёскі Сугвазды імчала белая “Волга”. Неўзабаве яна звярнула на вясковую вузкую дарогу, якая вяла да хутара Адама Кубіча. Хутар мясціўся на высокім пагорку, на супрацьлеглым баку, праз дарогу ад вёскі. На першы погляд, гэта была сапраўдная сядзіба заможных гаспадароў. Вакол моцна збудаванага драўлянага дома і некалькіх вялікіх хлявоў раскінуўся пышны сад. Бацька Адама, цяпер старэнькі дзед Сымон, быў сапраўдным садоўнікам. Таму ў садзе расло шмат дрэў і кустоў: яблыні, грушы, слівы, вішні, парэчкі, агрэст, маліна, размарын. З левага боку сядзібы цягнулася алея бяроз, а з правага – алея рабін. На падворку ўзвышаўся калодзеж, ля якога рос высокі клён. Ах, як ён палымнеў восенню, як высцілаў падворак каляровым – залатым і чырвоным – лісцем! Вачэй не адвесці.

Адам і яго жонка Марыя жылі вельмі дружна, шмат працавалі на зямлі і ў калгасе, мелі добрую гаспадарку: трымалі дзве каровы, пяць-шэсць авечак, свінаматку з парасятамі, не кажучы ўжо пра гусей, курэй і качак. У сям’і падрастаў адзіны сын Іван. Рос ён працавітым і гаспадарлівым, такім, як яго бацькі і дзяды.

У той час, калі белая “Волга” заехала на падворка і спынілася каля калодзежа, сям’я Адама палуднавала.

– Адась, глядзі, нейкія вялікія паны, мусіць, да нас прыехалі? – згледзела гасцей гаспадыня Марыя.

Адам зірнуў у акно, падняўся і накіраваўся да дзвярэй.

– Сядзіце пакуль дома, – я пагляджу, што ім трэба, – загадаў ён сямейнікам.





Насустрач Адаму з машыны пачалі выходзіць людзі – тры мужчыны і даволі сталая жанчына. Мужчыны былі апранутыя ў светлага колеру штаны і белыя кашулі-тэніскі. Жанчына – у стракатую лёгкую сукенку, а на галаве ў яе красаваўся прыгожа завязаны шалік-цюрбан. Твары незнаёмцаў падаліся Адаму вельмі загарэлымі.

Тым часам адзін з мужчын, самы сталы, накіраваўся да Адама і з вельмі прыязнай усмешкай працягнуў яму руку для прывітання.

– Добры дзень! Скажыце, калі ласка, тут жыве сям’я Адама Кубіча? Мы заязджалі ў сельсавет, дык нас накіравалі сюды, – сказаў чалавек, паціскаючы далонь Адама.

– Тут, патрапілі вы дакладна. Мяне завуць Адам, а дома – мая сям’я, – у адказ прамовіў гаспадар і, павярнуўшыся да вокан дома, махнуў сямейнікам, якія пільна сачылі за тым, што дзеецца на падворку: маўляў, выходзьце з хаты. На ганку з’явіліся Марыя і Іван, крыху пазней і дзядок Сымон з кульбаю выйшаў на падворак. Усе абступілі машыну прыехаўшых, пачалі знаёміцца, запрасілі ў хату, накрылі стол, запрашалі гасцей частавацца.

Калі крыху разнаёміліся, Адам запытаўся:

– Дык чаго, дарагія госці, вы з такой далечыні да нас прыехалі? Аж з самога Азербайджану?

За сталом стала ціха. І тады жанчына, якую звалі Фаціма Максудаўна паведаміла:

– Справа ў тым, што мой сын Рустам ваяваў у вашых мясцінах і недзе тут загінуў. Мы з мужам вельмі доўга шукалі звесткі пра яго, і вось у 1946 годзе даведаліся дакладна, што ён быў паранены пад Мінскам падчас адступлення нямецкіх войскаў. У ваенкамаце Масквы, а потым і Мінска нам дакладна ўказалі месца яго апошняга бою – каля вёскі Сугвазды Валожынскага раёна. Таму мы зрабілі такое вялікае падарожжа, каб знайсці сведкаў, якія бачылі нашага сына ў той час, пакланіцца яго магілцы.

Жанчына ледзь стрымлівала слёзы, твар яе стаў такім жалобным, што здавалася, яна на вачах пастарэла на дваццаць гадоў.

– Так, – падхапіў аповед маці Аміль, – а ў вашым сельскім савеце нам сказалі, што на помніку ў вясковым скверы, сапраўды, напісана імя нашага Рустама. І мы пакланіліся гэтаму абеліску і паклалі ўсім загінуўшым кветкі.

– Але да нас падыйшла старэнькая жанчына, пацікавілася, хто мы і адкуль, спытала, якое імя нас трывожыць з тых, што ўпісаныя на помніку, і расказала, што аднаго пораненага маладога салдаціка, дарэчы, нярускага, падабрала тады сям’я Адама Кубіча. Вось мы і завіталі да вас, каб даведацца, ці праўда гэта.

Крыху памаўчаўшы, Адам паклікаў бацьку:

– Тата, хадзі сюды! Раскажы пра салдаціка, якога вы з мамай хавалі падчас вайны. Аказваецца, гэта сын і брат гэтых шаноўных людзей.

Дзед Сымон ахвотна прысеў да стала і пачаў успамінаць.

– Было гэта ў ліпені сорак чацвёртага. Немцы пры адступленні былі вельмі злыя, палілі і рвалі на кускі ўсіх запар. Не шкадавалі ні малых, ні старых. Бой ішоў такі, што з-за дыму і агню не было відаць суседняй хаты. Потым, недзе праз два дні, фашыстаў пагналі нашы войскі далей, а мы пакрыху сталі вылазіць са сваіх сховішчаў. І вось раніцай пайшла мая жонка праз сад у бярэзнік, каб грыбкоў на суп насцінаць, і чуе – стогне нехта і кліча як бы. Жонка асцярожна пасунулася ў той бок і знайшла пад бярозаю параненага няруcкага хлопца, салдаціка. Яна паклікала на дапамогу мяне. Мы перацягнулі яго ў гумно, паклалі яго на стары ложак, на які накідалі сена і заслалі яго радзюшкай. Калі агледзелі хлопца, зразумелі, што ён вельмі моцна паранены. Баец крычаў, стагнаў, некага клікаў на сваёй мове, быў такі гарачы – не дакранучца! Мы пачалі думаць, што рабіць. Я з’ездзіў на кані па доктара ў Валожын, які неўзабаве таксама вызвалілі. Той прыехаў толькі на трэці дзень. А мы пачалі самі лячыць салдаціка: паілі сырадоем, раны абмылі, сталі прыкладаць да іх адвар з зёлак, даваць хвораму аспірын, каб неяк збіць тэмпературу… Потым і доктар нешта параіў-прыпісаў. Так цягнулася тры тыдні. Нам здавалася, што салдацік папраўляецца: ён адкрываў вочы, прасіў піць, нават сказаў, што яго завуць Рустам, што яго радзіма Азербайджан, і там яго чакаюць мама, тата і малодшыя браты, што ў яго вялікая радня, дружная і добразычлівая. З’явілася надзея, што хлопец выжыве, яму ж усяго дваццаты гадок пайшоў! Ды раптам зрабілася горай. Вечарам, калі мая жонка пайшла на выган па карову, пачула з гумна стогны. Яна пабегла туды, кінулася да байца, а ён ледзьве дыхае. Жонка залямантавала на ўсю ваколіцу. Я прыбег з хаты, узяў хлопца за руку, а пульса няма. Тут ён проста ў нас на вачах выдыхнуў два разы паветра з сябе, а на трэці рах замаўчаў. Толькі вочы свае цёмныя, як чорная парэчка, наставіў у нябёсы. Я сам іх і закрыў.

Пахавалі мы салдаціка, які за гэты час стаў для нас як родны сын, пад той самаю бярозкаю, пад якою і знайшлі параненага. А ўжо калі пасля канчатковай  перамогі над гітлераўскай Германіяй у цэнтры Сугваздаў пачалі ўзводзіць помнік загінуўшым салдатам, я паведаміў пра салдаціка мясцовым уладам, і старшыня сельсавета загадаў перанесці цела Рустама ў агульную магілу. Добра, што пры вашым сыну былі дакументы, то на помніку правільна напісалі яго прозвішча, імя і імя па бацьку – Рустам Гейдаравіч Мурадаў. Таму вы яго і знайшлі ў брацкай магіле.



У размову ўступіў сын Адама, Іван, і расказаў, што ў вёсцы штогод у Дзень перамогі ля помніка адбываецца ўрачысты, хоць і крыху жалобны, мітынг, на якім успамінаюць і перачытваюць усе імёны, напісаныя на абеліску. Школьнікі нясуць ганаровую вахту, насельнікі ўскладаюць кветкі.

– У нашай краіне ніхто не забыты, і нішто не забыта! – прыўзнята закончыў Іван.

Ён таксама хацеў сказаць нешта вельмі добрае і важнае гэтым людзям, якія праз дзесяць год пасля заканчэння вайны прыехалі ў далёкую Беларусь з Азербайджана, каб знайсці крывавы і апошні след свайго сына па той незабыўнай, страшэннай Вялікай Айчыннай вайне.

Аповед дзеда Сымона слухалі з вялікай увагай. Фаціма Максудаўна не магла стрымаць слёз і бясконца прыкладала да вачэй белую насоўку. Мужчыны, а імі аказаліся брат і сыны жанчыны, узрушана маўчалі.

Неўзабаве госці замітусіліся, пачалі збірацца ў дарогу.

– Куды вы нанач паедзеце? Заставайцеся, пераначуйце, у нас месца хопіць! – запрашалі іх Марыя і Адам, але тыя адмовіліся і, падзякаваўшы за гасціннасць, пайшлі  з хаты. Аміль – брат Фацімы – дастаў з багажніка машыны вялікі мех, паставіў яго перад Адамам і сказаў:

– Гэта пачастункі з нашай радзімы – грэцкія арэхі. На вашай зямлі яны не растуць. Прыміце, калі ласка!

Затым да Марылі і Івана падыйшлі Фаціма і яе сыны. У руках яны трымалі плеценыя кошыкі з усялякімі ўсходнімі прысмакамі. Інжыр, абрыкосы, персікі… – чаго там толькі не было! І напраканцы да ног дзеда Сымона малодшы Назар выкаціў вялікі буталь, аплецены вінаградным лазой, з вінаградным вінам.

– Навошта, дарагія госці? Нам вельмі няёмка прынімаць столькі падарункаў! – адмаўляліся сямейнікі Адама Кубіча, якія насамрэч ніколі не каштавалі ні грэцкіх арэхаў, ні інжыра, ні абрыкосаў.

– Вазміце, калі ласка, вы ж цяпер для нас  –  самыя дарагія людзі, мы

цяпер ужо з вамі – сваякі. Вы сёння стварылі для нас сапраўднае свята, самы шчаслівы дзень у нашым жыцці. Прыязджайце да нас у Азербайджан, мы жывём у Баку. Будзем вельмі рады бачыць усіх на нашай радзіме! – палымяна і шчыра прамаўляў  Гейдар і ўжо ўсоўваў у далонь Івана картку з адрасам.

Шчаслівыя азербайджанцы ад’ехалі на заходзе сонца. Яны накіраваліся ў Мінск, дзе збіраліся пераначаваць у гатэлі, залатвіць некалькі сваіх спраў, а затым адправіцца дадому, у свой сонечны Азербайджан.

Паміж імі і Кубічамі ўстанавілася перапіска, у асноўным, у выглядзе віншаванняў са святамі і тэлефанаваннямі. Новыя знаёмыя прыязджалі ў Сугвазды яшчэ два-тры  разы. І кожны раз абавязкова з мехам грэцкіх арэхаў. ■